ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА 3 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 22 СНЕЖНЯ 1977 г.

№ 36 (1186)

Цана 2 кап.

## ПОШУК УЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА ПОСПЕХАМ

**З кожным годам у свеце памяншаюцца запасы серабра. Вялізная колькасць здабываемага металу ідзе на патрэбы фатаграфіі. Перад вучонымі востра паўстала пытанне: чым замяніць серабро ў працэсе атрымання фатаграфічных адбіткаў?**

**У нас ва універсітэце адкрыт і распрацаван прынцыпова новы спосаб атрымання фотаслаёў бессярэбранага праяўлення. Гэтым займаецца лабараторыя пад кіраўніцтвам прафесара, доктара хімічных навук Вадзіма Васільевіча СВІРЫДАВА.**

**Я сустрэўся са старшым навуковым супрацоўнікам гэтай лабараторыі Д. Шаўчэнка і папрасіў яе адказаць на некаторыя пытанні.**

**— Скажыце, калі ласка, якое народнагаспадарчае значэнне мае распрацоўка спосабу падрыхтоўкі і атрымання фотаслаёў бессярэбранага праяўлення?**

— Спосаб, які распрацаван намі пад кіраўніцтвам прафесара В. В. Свірыдава, мае шмат станоўчага. Па-першае, увесь працэс адбываецца з выкарыстаннем старога абсталявання. Па-другое, колькасць серабра, выкарыстаная пры новым метадзе, памяншаецца прыкладна ў 1000 разоў. Замест дорагакаштуючага серабра мы выкарыстоўваем такія металы, як медзь, нікель і іншыя.

**— Дзе яшчэ займаюцца распрацоўкай гэтай праблемы?**

— Асноўную нагрузку па распрацоўцы і ўкараненню новага спосабу нясе наша лабараторыя. Але гэтым пытаннем займаюцца яшчэ ў Новасібірску, Маскве, а таксама Пераяслаўлі-Залескім.

**— Колькі часу лабараторыя займаецца пытаннем падрыхтоўкі фотаслаёў бессярэбранага праяўлення, і калі гэты метад будзе ўкаранён у шырокую вытворчасць?**

— Распрацоўку гэтай праблемы наша лабараторыя пачала ў 1969 годзе. Трэба адзначыць, што гэты метад ужо прымяняецца ў спецвытворчасці. Але ў асноўным ён будзе адпрацаван і ўкаранён да 1985 года.

**— Якая якасць новага спосабу атрымання фатаграфій?**

— Узоры, якія мы атрымалі, адпавядаюць ГОСТу. Спачатку ўзніклі цяжкасці па захаванню медных адбіткаў, бо медзь акіслялася і фотаадбіткі псаваліся. Але цяпер мы знайшлі спосаб захавання медных узораў.

**У. ДЗЬЯКАЎ,**
студэнт II курса журфака.

## Чытаючы Асноўны Закон

«Савецкая дзяржава, усе яе органы дзейнічаюць на аснове сацыялістычнай законнасці, забяспечваюць ахову правапарадку, інтарэсаў грамадства, правоў і свабод грамадзян».

(Канстытуцыя СССР, артыкул 4).

**Як вядзецца работа па прапагандзе новай Канстытуцыі СССР? На гэтае пытанне адказвае дэкан юрыдычнага факультэта В. Ф. Чыгір:**

— На ўсіх курсах, ва ўсіх групах чытаюцца даклады, праходзяць палітычныя інфармацыі. Нядаўна на факультэт прыйшоў ліст з гаркома партыі г. Баранавіч: «Лекцыя пра новую Канстытуцыю СССР, якую чытаў таварыш Я. М. Тагуноў, дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, была праведзена на высокім навуковым і ідэйна-тэарэтычным узроўні. Мы ўдзячны вам за такія грунтоўныя лекцыі».

Каля 60 лекцый і дакладаў аб Канстытуцыі СССР прачыталі супрацоўнікі факультэта.

**— З якімі пачуццямі сустрэлі Вы новы Асноўны Закон Савецкай краіны?— пытанне да прафесара, загадчыка кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва А. А. Галаўко.**

— З пачуццём гонару за сваю сацыялістычную Айчыну, удзячнасці роднай ленінскай партыі, яе Цэнтральнаму Камітэту. Я прымаў удзел у працы камісіі па падрыхтоўцы праекта новай Канстытуцыі СССР у Маскве. Новы Асноўны Закон СССР, які з'яўляецца пераемнікам папярэдніх савецкіх канстытуцый і ў якім выкарыстан вопыт канстытуцыйнага развіцця брацкіх сацыялістычных краін, зыходзячы з ленінскіх прынцыпаў дзяржаўнага будаўніцтва, адлюстраваў асноўныя рысы развітога сацыялістычнага грамадства.

Як юрыста мяне асабліва цікавіць тая частка Канстытуцыі, дзе размова ідзе пра дзяржаву і асобу.

**— Якія змены ўведзены ў новую Канстытуцыю з юрыдычнага пункту гледжання?**

— Новыя дапаўненні і змены ў крымінальна-працэсуальным кодэксе, не аслабляючы строгасці пакарання ў адносінах да асоб, якія ўчынілі небяспечныя злачынствы, заклікаены забяспечыць больш дыферэнцыраваны падыход да вызначэння пакарання. Гаворка ідзе аб расшырэнні існуючай практыкі пакаранняў, не звязаных з пазбаўленнем волі, а таксама аб ужыванні мер адміністрацыйнага і грамадскага ўздзеяння.

Уведзена адтэрміноўка выканання прыгавору непаўналетнім. Калі падлетак аступіўся ўпершыню і асуджан не больш чым на тры гады пазбаўлення свабоды, суд з улікам асобы вінаватага і ступені грамадскай небяспекі злачынства можа адкласці выкананне прыгавору тэрмінам ад 6 месяцаў да 2 гадоў. Пры такой адтэрміноўцы суд можа абавязаць падлетка паступіць на работу або вучобу, ліквідаваць нанесеныя страты. Кантроль за яго паводзінамі ўскладзен на органы ўнутраных спраў, а таксама на камісіі пры выканкомах Саветаў.

Моладзь — наша будучае. Яна актыўна і самаадданa ўдзельнічае ў будаўніцтве ў нашай краіне камунізму. Аднак нельга не лічыцца з тымі з'явамі, якія так або інакш сведчаць аб хібах у выхаванні асобных маладых людзей. XXV з'езд КПСС, як вядома, востра паставіў пытанне аб неабходнасці арганічнага спалучэння ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання падрастаючага пакалення.

**— Анатолій Аляксандравіч, Вы — стары салдат. Раскажыце, калі ласка, што стаіць, на Вашу думку, за лаканічнымі словамі: «Абарона сацыялістычнай Айчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР».**

— Для чалавека самае дарагое, блізкае і святое — Радзіма. Наша Айчына — радзіма ленінізму, на нашай зямлі перамагла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, створана першая ў свеце агульнанародная дзяржава, упершыню пабудавана грамадства роўных людзей. Гэта вялікія заваёвы, і іх трэба берагчы.

Пакуль мы жывём у неспакойным свеце, свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна заключаецца ў тым, каб заўсёды быць гатовым абараніць сацыялістычную Айчыну.

З думкай аб Радзіме пачынаецца кожны працоўны дзень савецкіх людзей.

**— Вашы пажаданні прапагандыстам новай Канстытуцыі СССР?**

— Асаблівую ўвагу варта звярнуць на павышэнне ўзроўню ідэйна-палітычнага выхавання моладзі. Важна, каб юнакі і дзяўчаты ўспрымалі нашы вялікія ідэі не як зазубраны ўрок, а як сістэму ўласных поглядаў і перакананняў.

**Гутарку вёў А. МАРЧУК.**

Зімовая залікова - экзаменацыйная сесія бягучага навучальнага года ва універсітэце будзе праходзіць у знамянальны перыяд, калі савецкі народ, натхнёны рашэннямі XXV з'езда КПСС, паспяхова завяршае планы камуністычнага будаўніцтва другога года дзесятай пяцігодкі — пяцігодкі эфектыўнасці і якасці. Уходзячы год знамянальны яшчэ і тым, што ён быў юбілейным для нашай краіны, годам прыняцця новай Канстытуцыі СССР, замацаваўшай поспехі Краіны Саветаў за 60 слаўных гадоў яе існавання.

У святле такіх гістарычных падзей зразумела імкненне студэнтаў універсітэта больш паспяхова падрыхтавацца і здаць прадстаячыя экзамены і залікі. Аднак задачы гэтыя не мі назіраюцца сур'ёзныя недахопы. Нярэдкія, напрыклад, выпадкі, калі работа на працягу семестра працякае бяспланава, неарганізавана, калі маюць месца дні поўнага адпачынку і дні стамляючай напружанасці. Усё гэта яўна супярэчыць аднаму з важнейшых патрабаванняў навуковай арганізацыі самастойнай працы студэнтаў — яго планамернасці, арганізаванасці і сістэматычнасці.

Але якой бы ідэальнай ні была арганізацыя вучэбнай працы студэнта на працягу ўсяго семестра або навучальнага года, дадатковая падрыхтоўка да экзаменаў і залікаў з'яўляецца, як паказвае вопыт, неабходнай.

Пачынаць яе пажадана своечасова — за месяц-паўтара да

**М. У. ПІСКУНОЎ,**
**доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі.**

## ЯК РЫХТАВАЦЦА ДА ЭКЗАМЕНАЎ І ЗАЛІКАЎ

з лёгкіх. Яны патрабуюць правільнай навуковай арганізацыі працы як пры падрыхтоўцы, так і пры здачы экзаменаў і залікаў. Аб некаторых навуковых рэкамендацыях і пойдзе размова.

Экзамены і залікі — вынік работы студэнтаў над важнейшымі тэарэтычнымі і практычнымі курсамі за паўгоддзе ці навучальны год. Асноўнае іх прызначэнне — не толькі кантроль, а, галоўным чынам, здзяйсненне адукацыйных і выхаваўчых функцый. У ходзе падрыхтоўкі да экзамена ці заліку студэнты, паўтараючы вучэбны матэрыял, прыводзяць усе веды ў парадак, у сістэму, часам па-новаму асэнсоўваюць, абагульняюць іх і засвойваюць вучэбны прадмет як адзінае цэлае, лагічна стройнае, як навуковую дысцыпліну. У працэсе авалодання ведамі ці іх сістэматызацыі адбываецца далейшае павышэнне ўзроўню камуністычнай свядомасці і паводзін студэнтаў.

Агульнавядома, што залогам паспяховай здачы экзаменаў і залікаў з'яўляецца сістэматычная, добрасумленная работа студэнтаў на працягу ўсяго семестра ці навучальнага года. Вопыт паказвае, што нават больш падрыхтаваныя студэнты не могуць засвоіць увесь вучэбны матэрыял па таму ці іншаму вывучаемаму курсу штурмам. Да таго ж «штурмавы» спосаб вывучэння вучэбнага матэрыялу, як устанаўлівае псіхалогія, прыводзіць да хуткага яго забывання. Адсюль — адно з важнейшых педагагічных правілаў: каб дабіцца на залікова - экзаменацыйнай сесіі высокіх вынікаў, неабходна на працягу ўсяго семестра ці года займацца сістэматычна і планамерна. Толькі такая падрыхтоўка забяспечвае цвёрдыя і трывалыя веды.

На жаль, у арганізацыі самастойнай работы некаторых студэнтаў над вучэбнымі курсамі

пачатку залікова - экзаменацыйнай сесіі. Тэрмін гэты неабходны таму, што паўтарыць адразу ўвесь пройдзены паўгадавы ці гадавы вучэбны матэрыял аднaчасова па ўсіх прадметах, якія вынесены на экзаменацыйную сесію, фізічна немагчыма.

Таму кожнаму студэнту неабходна наперад вызначыць і сплanaваць час для паўтарэння. Адзіным крытэрыем пры гэтым з'яўляецца ступень цяжкасці прадметаў, якія патрэбна паўтарыць. Для кожнага студэнта яны будуць рознымі. У адпаведнасці з цяжкасцямі прадметаў вызначаецца і чарговасць падрыхтоўкі да іх. Так узнікае неабходнасць у складанні індывідуальных планаў падрыхтоўкі студэнтаў да залікова - экзаменацыйнай сесіі, у якіх лёгкія і цяжкія прадметы павінны чаргавацца.

Між тым, пры наяўнасці розніцы ў падрыхтоўцы да экзаменаў і залікаў кожны студэнт можа зыходзіць з агульнага патрабавання — размеркавання бюджэту вучэбнага часу, звярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на недапушчальнасць вучэбнай перагрузкі. Вось чаму важна, каб у індывідуальных планах падрыхтоўкі да экзаменаў і залікаў знайшлі адлюстраванне не толькі пытанні арганізацыі працы, але і адпачынку студэнтаў.

Разам з тым пры наяўнасці добрага плана важна дабіцца яго дакладнага выканання, строгага захавання рэжыму дня і асабліва чаргавання разумовай працы з адпачынкам. Натуральна, што ў перыяд падрыхтоўкі і самой сесіі ўсемагчымыя ўвесяленні павінны быць строга абмежаваны. Заняткі фізкультурай і спортам пажадана зрабіць умеранымі, а паўнацэнны сон і прагулкі перад сном на свежым паветры — строга абавязковымі.

(Працяг будзе).



Адказная пара зараз у першакурснікаў — падрыхтоўка да першай сесіі. Ад паспяховай яе здачы ў многім залежыць іх далейшая вучоба.

Старанна займаюцца ў час лабараторных заняткаў па марфалогіі раслін студэнткі I курса біяфака.

Фота **В. Драчова.**

# АНК

**УВАЖАЕМЫЙ ТОВАРИЩ!**

**Комитет комсомола и студенческая с[illegible] логическая лаборатория при комитете комсомола БГУ имени В. И. Ленина проводят данное исследование с целью изучения сложившихся у Вас за время учебы в университете представлений о студенческой жизни и о том, как Вы готовитесь к профессиональной и общественной деятельности.**

**Внимательно прочтите вопросы анкеты и**

**1. Чем Вы занимались непосредственно перед поступлением в университет?**

1. Учился (-лась) в школе.
2. Учился (-лась) в техникуме.
3. Работал (-а).
4. Работал (-а) и занимался (-лась) на подготовительном отделении.
5. Служил в рядах Советской Армии.
6. Временно не работал.
7. ______________________

**2. Чем привлекала Вас учеба в вузе?** (Возможно несколько ответов).

1. Возможностью получить интересующую меня специальность.
2. Престижем данного вуза.
3. Престижем высшего образования.
4. Романтикой студенческой жизни.
5. Возможностью перейти из деревни в город.
6. Богатством культурной жизни.
7. Возможностью в будущем заниматься научно-исследовательским трудом.
8. Возможностью в дальнейшем быть хорошо материально обеспеченным.
9. Возможностью получить глубокие и всесторонние знания.
10. Возможностью сохранить профессиональные традиции семьи.
11. Возможностью продлить время беззаботной жизни.
12. Тем, что в вузах учится большинство моих друзей.
13. Не задумывался (-лась).
14. ______________________

**3. Если бы Вам пришлось выбирать заново, то каково было бы Ваше решение?**

1. Выбрал (-а) бы тот же вуз и ту же специальность.
2. Выбрал (-а) бы тот же вуз, но другую специальность.
3. Выбрал (-а) бы другой вуз, но ту же специальность.
4. Выбрал (-а) бы другой вуз и другую специальность.
5. Выбрал (-а) бы работу и учебу.
6. Выбрал (-а) бы работу.
7. ______________________

**4. Изменилось ли Ваше представление об учебе в вузе и о студенческой жизни после поступления в университет?**

| | Да | Нет |
|---|---|---|
| Об учебе | 1 | 2 |
| О студенческой жизни | 3 | 4 |

**5. Какие трудности в учебе оказались для Вас особенно непредвиденными?** (Возможно несколько ответов).

1. Самостоятельное, без внешнего контроля распределение времени.
2. Отсутствие умения самостоятельно работать над книгой.
3. Неумение конспектировать лекции.
4. Неумение пользоваться справочной литературой.
5. Большая лекционная нагрузка.
6. Большой объем самостоятельных занятий.
7. Пробелы в знаниях.
8. ______________________

**6. Что Вам больше всего нравится в студенческой жизни?** (Возможно несколько ответов).

1. Свободный обмен мнениями.
2. Демократизм вузовской общественной жизни.
3. Широкое общение со сверстниками.
4. Возможность глубокого изучения любимого предмета.
5. Возможность получения разносторонних знаний.
6. Возможность широкого общения с учеными.
7. Возможность участия в научной работе.
8. Возможность участия в работе студенческих творческих объединений.
9. Возможность культурного роста.
10. Студенческая солидарность.
11. Интернациональные молодежные связи.
12. Забота со стороны старших.
13. Возможность интересного проведения свободного времени.
14. ______________________

**7. Что, по Вашему мнению, в наибольшей степени определяет положительное отношение студентов к учебе?** (Возможно несколько ответов).

1. Глубина и прочность знаний, полученных в школе (техникуме, училище).
2. Жизненный опыт, приобретенный до поступления в вуз.
3. Интерес к специальности.
4. Трудолюбие.
5. Чувство долга.
6. Талант и мастерство преподавателя.
7. Требовательная и деловая атмосфера в академической группе.
8. Сочетание учебной деятельности с научно-исследовательской.
9. Материальная заинтересованность в получении стипендии.
10. ______________________

**8. А чем, на Ваш взгляд, можно объяснить формальное отношение к учебе некоторой части студентов?** (Возможно несколько ответов).

1. Отсутствием интереса к будущей специальности.
2. Неразвитыми чувствами долга и ответственности.
3. Ленью.
4. Неорганизованностью.
5. Слабым представлением о своей будущей специальности.
6. Реакцией на формальное отношение некоторых преподавателей к своей работе.
7. Низкой требовательностью преподавателей.
8. Подверженностью «недопустимым», с точки зрения строгой академической дисциплины, настроениям.
9. Материальной независимостью.
10. ______________________

**9. Что, по Вашему мнению, необходимо сделать, чтобы повысить качество учебы и учебную активность студентов?** (Возможно несколько ответов).

1. Улучшить консультативно-методическую работу на курсе, факультете.
2. Улучшить обеспечение студентов учебной, методической, справочной литературой.
3. Повысить персональную требовательность преподавателей к студентам в выполнении учебных заданий.
4. Улучшить материально-техническое обеспечение лабораторных и практических занятий.
5. Укрепить связь учебной и научно-исследовательской работы студентов.
6. Свести до минимума дублирование учебного материала в различных курсах.
7. Улучшить условия для самостоятельной работы студентов.
8. ______________________

**10. Какие проблемы чаще всего вызывают дискуссии среди Ваших товарищей?** (Возможно несколько ответов).

1. Научные проблемы.
2. Не решенные на лекциях вопросы.
3. Вопросы студенческого быта.
4. Вопросы международной и внутриполитической жизни.
5. Внутриэкономические проблемы.
6. Морально-этические проблемы.
7. Культурно-эстетические проблемы.
8. Вопросы взаимоотношения поколений.
9. Мода.
10. ______________________

**11. Выясняете ли Вы нерешенные в ходе обсуждений вопросы у преподавателей?**

1. Да, почти всегда.
2. Да, но не всегда.
3. Да, но очень редко.
4. Нет.

**12. Занимаетесь ли Вы научно-исследовательской работой во внеучебное время?**

1. Да.
2. Нет.

**13. Какова форма студенческого научного коллектива, в котором Вы работаете?**

1. Научный кружок при кафедре.
2. Студенческое конструкторское, проектное или технологическое бюро.
3. Студенческая научно-исследовательская лаборатория.
4. Студенческий вычислительный центр при кафедре или научном подразделении.
5. Группа, выполняющая хоздоговорную или бюджетную тему.
6. ______________________

**14. Каков характер выполняемой Вами научно-исследовательской работы?**

1. Индивидуальная теоретическая (в т. ч. обществоведческая) работа над самостоятельной темой.
2. Индивидуальная теоретическая (в т. ч. обществоведческая) работа над частью общей темы.
3. Коллективная теоретическая (в т. ч. обществоведческая) работа над общей темой.
4. Индивидуальная теоретико-прикладная работа над самостоятельной темой.
5. Индивидуальная теоретико-прикладная работа над частью общей темы.
6. Коллективная теоретико-прикладная работа над общей темой.
7. Индивидуальная экспериментально-прикладная работа над самостоятельной темой.
8. Индивидуальная экспериментально-прикладная работа над частью общей темы.
9. Коллективная экспериментально-прикладная работа над общей темой.
10. Индивидуальная научно-вспомогательная работа по общей теме.
11. Индивидуальная научно-вспомогательная работа по отдельной теме.
12. Коллективная научно-вспомогательная работа по общей теме.

**15. В какой степени Вы самостоятельны на следующих этапах исследовательского процесса?**

| | Выполняю самостоятельно | Выполняю совместно с научным руководителем |
|---|---|---|
| Поиск проблемы, её формулирование и обоснование | 1 | 13 |
| Составление программы и плана исследования | 2 | 14 |
| Разработка методики исследований | 3 | 15 |
| Сбор информации для выдвижения гипотез и их обоснования | 4 | 16 |
| Проведение основных экспериментальных работ | 5 | 17 |
| Выполнение научно-вспомогательных работ | 6 | 18 |
| Описание экспериментальных данных | 7 | 19 |
| Анализ экспериментальных данных | 8 | 20 |
| Анализ, обобщение фактических материалов и определение выводов | 9 | 21 |
| Подготовка доклада, сообщение о результатах исследования | 10 | 22 |
| Написание научного отчета, записки и т. п. | 11 | 23 |
| Подготовка результатов исследований к публикации | 12 | 24 |

**16. Считаете ли Вы, что в Ваши обязательные учебные занятия включены элементы научно-исследовательской работы?**

| | Да, включены | Включены, но недостаточно | Не включены |
|---|---|---|---|
| По общественным наукам общего цикла (истории КПСС, марксистско-ленинской философии, политической экономии, научному коммунизму). | 1 | 4 | 7 |
| По общим специальным дисциплинам (в том числе по общественным). | 2 | 5 | 8 |
| По узким специальным дисциплинам (в том числе по общественным). | 3 | 6 | 9 |

**17. Какими мотивами Вы руководствовались, начав заниматься научно-исследовательской работой?** (Возможно несколько ответов).

1. Интересом к познанию.
2. Возможностью расширить свой кругозор.
3. Интересом к данной науке.
4. Интересом к определенной проблеме.
5. Пониманием недостаточности своих специал[illegible]х знаний.
6. Стремлением овладеть навыками исследовательской работы.
7. Стремлением проявить свои способности.
8. Желанием улучшить свое материальное положение.
9. Желанием не отстать от товарищей.
10. Стремлением работать под руководством настоящего ученого.
11. Пониманием того, что участие в НИР поможет подготовить хорошую курсовую или дипломную работу.
12. Пониманием того, что активная научно-исс[illegible]вательская работа учитывается при распределении.
13. ______________________

**18. Совпадает ли тема Вашей научной работы с курсовой или дипломной работой?**

1. Полностью совпадает.
2. Совпадает частично.
3. Не совпадает.

**19. Ваше участие в конкурсах студенческих работ, выставках, научных конференциях.**

1. Участвовал несколько раз.
2. Участвовал один раз.
3. Не участвовал.

**20. Если Вы участвовали в конкурсах студенческих работ, выставках, научных конференциях, то поощрялись ли Ваши работы?**

1. Да.
2. Нет.

**21. Учитесь ли Вы в полную меру своих сил и возможностей?**

1. Да.
2. Не совсем.
3. Нет.

**22. Если нет, то что является тому причиной?**

1. Личная неорганизованность.
2. Слабая помощь со стороны преподавателей.
3. Отсутствие навыков самостоятельной работы.
4. Увлеченность неучебными делами.
5. Отсутствие нормальных домашних условий.
6. Материальные затруднения.
7. Отсутствие интереса к будущей профессии.
8. Низкая требовательность преподавателей.
9. Низкая требовательность товарищей.
10. Считаю, что не все, изучаемое в университете, понадобится в работе по будущей специальности.
11. Низкий уровень предшествующей подготовки
12. Что другое, укажите

**23. В какой степени Вы удовлетворены?**

| | Вполне удовлетворен | Отчасти удовлетворен | Не удовлетворен |
|---|---|---|---|
| Учебным режимом | 1 | 2 | 3 |
| Организацией аудиторных занятий | 4 | 5 | 6 |
| Обеспечением лабораторных (практических) занятий | 7 | 8 | 9 |
| Организацией консультаций | 10 | 11 | 12 |
| Руководством, написанием курсовых, дипломных работ | 13 | 14 | 15 |
| Библиотечным обслуживанием | 16 | 17 | 18 |
| Организацией питания в учебном корпусе | 19 | 20 | 21 |

**24. Отметьте, пожалуйста,**

| | что преобладает на Вашем факультете в учебно-воспитательном процессе | что Вам лично больше всего импонирует |
|---|---|---|
| Высокая требовательность, сочетающаяся с уважением к студентам | 1 | 15 |
| Высокая требовательность, но не обязательно сочетающаяся с | | |

# КАМУНІСТЫ — САЛДАТЫ СВАБОДЫ

Ў актавай зале інтэрната № 5 збіраюцца студэнты юрыдычнага факультэта: адбудзецца вечар-абмеркаванне кінафільма «Салдаты свабоды». Галя Буката, арганізатар вечара, клапоціцца, каб і месцы для гасцей былі падрыхтаваны, і зала прыбрана як належыць.

І вось слова прадастаўлена студэнту Віктару Макаруку:

— Фільм «Салдаты свабоды» — аб камуністах, людзях, якія змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Гэта было змаганне не толькі армій, але і сутыкненне дзвюх грамадскіх сістэм. Гэта была барацьба народаў супраць самых агрэсіўных сіл імперыялістычнага свету.

Вялікай цаной дасталася нам перамога. Але гады многаму навучылі, паказалі, што найбольш паслядоўнымі, найбольш стойкімі змагарамі за свабоду і незалежнасць, за дэмакратыю з'яўляюцца ў наш час камуністы».

Словы, якія належаць Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжневу, успамінаюцца за час прагляду фільма неаднойчы. Яны складаюць сэнс кожнага эпізода кінастужкі.

Аляксей Васільеў расказаў аб арганізацыі антыфашысцкай барацьбы ў Венгрыі, аб гераізме і мужнасці савецкіх воінаў, усіх тых, хто прымаў удзел у вызваленні гэтай краіны ад фашыстаў.

А Алег Любіч цікава і змястоўна расказаў, як на працягу ўсяго фільма паказана разгортванне антыфашысцкай барацьбы ў Польшчы.

Выкладчыца Валянціна Васільеўна Сарокіна, удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, расказала аб тых цяжкасцях, якія прыйшлося перажыць усяму савецкаму народу ў гадзіну фашысцкай навалы.

З вялікай цікавасцю слухалі студэнты і другога ўдзельніка вайны — воіна 1-га Беларускага фронту Мікалая Пятровіча Галышава. Нехта з прысутных спытаў у ветэрана, ці бывае пачуццё страху ў атацы. Мікалай Пятровіч упэўнена адказаў:

— Не. Адчуваеш, што ты не адзін, што з табой тысячы такіх; думаеш пра тое, як імгненна, хутка дабіцца перамогі. Толькі наперад!

Многія студэнты дапаўнялі выступленні сваімі заўвагамі, дзяліліся думкамі і ўражаннямі. Яны адзначылі, што кінаэпапея «Салдаты свабоды» вельмі своечасовая і патрэбная. **В. ШКАЛА.**

## КАМІСІЯ ДЗЕЙНІЧАЕ

**Вучэбна-выхаваўчая камісія біялагічнага факультэта мае цікавы вопыт работы, які можна выкарыстаць на іншых факультэтах.**

**— Камісія, — гаворыць сакратар камітэта камсамола Людміла Перадрый, — створана на факультэце ў мінулым годзе. У яе ўваходзяць члены акадэмічных сектараў груп. Гэта дазваляе весці работу канкрэтна і мэтанакіравана. Узначальваюць ВВК трэцякурснікі Н. Жук і П. Арлоў. Дабівацца добрай і выдатнай паспяховасці студэнтаў—асноўная задача яе дзейнасці. На пасяджэннях вырашаюцца пытанні аб лепшым забеспячэнні студэнтаў кнігамі. Сістэматычна арганізуюцца навуковыя семінары і дыспуты. Сумесна з рэдкалегіяй члены камісіі выпускаюць «Камсамольскі пражэктар».**

**Т. МАНЁНАК.**



## ПЕСНЯ, ЯКАЯ ЗМАГАЕЦЦА

**Нататкі з фестываля палітычнай песні БДУ**

На сцэну выйшлі юнакі і дзяўчаты, загучала знаёмая мелодыя... Так пачаўся фестываль палітычнай песні. У ім прынялі ўдзел студэнты многіх факультэтаў універсітэта, супрацоўнікі вылічальнага цэнтра, слухачы падрыхтоўчага аддзялення.

Гэта быў адзін з тых шматлікіх фестываляў, якія праводзяцца зараз у нас у краіне, ды і не толькі ў нас. Думаю, не памылюся, калі скажу, што цяпер уся моладзь свету жыве ў чаканні XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

...Грозныя гукі песні чылійскіх патрыётаў «Венсэрэмас» напоўнілі аўдыторыю. «Артысты» знаходзіліся ў зале, слухалі выступленні, потым выходзілі на сцэну, бралі ў рукі гітары, садзіліся за раяль і спявалі.

Многія, як гэта ні дзіўна, разумеюць палітычную песню як нейкае «збудаванне» з громкіх лозунгаў і заклікаў, суправаджаемае адпаведным выразам вачэй і рухамі рук. Таму хачу прывесці словы фінскай спявачкі Анарыыты Мінкінен, сказаныя на Міжнародным фестывалі маладзёжнай песні ў Сочы: «Я стараюся стварыць сплаў з палітыкі і фальклору. Песня павінна быць зразумела ўсім, яна павінна прымушаць чалавека думаць».

«...Як хацелася жыць і смяяцца...» — Лена Бялова, фізік, падаўшыся крыху наперад, была кволая і безабаронная. Яна гаварыла нараспеў дрыжачым голасам, вось-вось на вачах маглі праступіць слёзы. Але не — голас гучаў упэўнена.

Песня была як размова — размова з гледачом на роўных. Галоўнае, што падкупляла на фестывалі — выкананне сваіх песень. Выходзяць звычайныя юнакі і дзяўчаты і прапануюць аўдыторыі сваё, тое, што імі створана.

Фестываль стаў святам песні, песні-агітатара, песні-разважання, песні-барацьбіта.

**М. МІНАКОВА,**
**студэнтка журфака.**

**Песню «Венсэрэмас» выконвае хор падрыхтоўчага факультэта.**

Фота **В. Патапенкі.**

## ЯК ЖЫВЕШ, ХІМІК?

У камітэце камсамола хімфака добрая слава ідзе пра Аляксандра Кузьміна і Уладзіміра Ломскага. Яны ўзначальваюць турыстычны сектар. Гэта, мабыць, самая масавая арганізацыя на факультэце. Амаль кожны месяц у розныя куткі нашай краіны адпраўляюцца турыстычныя атрады.

Добра працуюць на хімфаку і мастацкія калектывы. У іх даўно ідзе падрыхтоўка да агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці універсітэта. Таня Капанчук і Лена Дробыш, нязменныя кіраўнікі адпаведнага сектара ў камітэце камсамола факультэта, расказваюць, што хімікі падтрымліваюць сувязь з іншымі мастацкімі калектывамі сталіцы. Сёлета іх шэфамі з'яўляецца тэатр музычнай камедыі.

Хочацца адзначыць таксама работу групы «Доўг», старшынёй якой з'яўляецца Ізабэла Плютай. Група існуе нядаўна. Але работа праведзена значная. Многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны працуюць на кафедрах факультэта, з імі праводзяцца сустрэчы, гутаркі. Хутка адбудзецца сустрэча студэнтаў з аўтарам кнігі «Руіны страляюць ва ўпор» А. Новікавым. У будучым плануецца зрабіць выстаўку матэрыялаў групы «Доўг».

Нельга не ўпамянуць работу камітэта камсамола ў сістэме камсамольскай палітвучобы. Раз у два тыдні збіраецца на свае чарговыя заняткі камсамольскі актыў. Камсоргі лепшых груп дзеляцца вопытам сваёй работы.

Кожны тыдзень перад першакурснікамі выступаюць студэнты-выдатнікі, якія дзеляцца вопытам сваёй вучобы, чытаюць лекцыі.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**

### З гісторыі

## АБ СТАРАЖЫТНЫМ КОМПАСЕ

Павольна цягнуцца вярблюды па выпаленай сонцам пустыні Гобі. Шлях іх далёкі. Нібы бяскрайняе жоўтае мора, калышуцца барханы. Пасярод каравана ганарова выступае белы вярблюд. У яго на спіне драўляная разная клетка, а ў ёй — невялікі гліняны гаршчок, у якім на корку плавае ў вадзе маленькі кавалачак намагнічанага жалеза. Бакі гаршка пафарбаваны ў чатыры колеры: чырвоны — азначае поўдзень, чорны — поўнач, зялёны — усход і белы — захад...

Гліняная пасудзіна з кавалачкам жалеза была старажытным компасам, які ўказваў дарогу каравану ў бяскрайніх пясках пустыні.

Яшчэ за 300—400 гадоў да н. э. маракі выкарыстоўвалі магнітную стрэлку ў сваіх плаваннях. Але толькі ў XIV ст. італьянец Флавіа Джойя зрабіў компас з дыскам і дзяленнямі, падобны да сучаснага.

Выкарыстоўваючы магнітнае поле Зямлі на працягу тысячагоддзяў, чалавек стаў дэталёва вывучаць яго толькі 300—400 гадоў назад.

Магнітафон і электрабрытва, дынамік і магутны цыклатрон паявіліся толькі дзякуючы таму, што вучоныя пранікл і ў сутнасць з'яў магнетызму.

**Б. РОЗЭН,**
**дацэнт.**

## МЫСЛИ О НАУКЕ

В науке нет широкой столбовой дороги, и только тот может достигнуть ее сияющих вершин, кто, не страшась усталости, карабкается по ее каменистым тропам.

**К. МАРКС.**

В отличие от других архитекторов, наука не только рисует воздушные замки, но и возводит отдельные жилые этажи здания, прежде чем заложить его фундамент.

**К. МАРКС.**

Научные истины всегда парадоксальны, если судить на основании повседневного опыта, который улавливает лишь обманчивую видимость вещей.

**К. МАРКС.**

В науке каждая новая точка зрения влечет за собой революцию в ее технических терминах.

**Ф. ЭНГЕЛЬС.**

Ум человеческий открыл много диковинного в природе и откроет еще больше, увеличивая тем свою власть над ней...

**В. И. ЛЕНИН.**

Человеческое мышление по природе своей способно давать и дает нам абсолютную истину, которая складывается из суммы относительных истин. Каждая ступень в развитии науки прибавляет новые зерна в эту сумму абсолютной истины, но пределы истины каждого научного положения относительны, будучи то раздвигаемы, то сужаемы дальнейшим ростом знания.

**В. И. ЛЕНИН.**

Наука неотделима от политики. От политики, от ее направления зависит, будет ли наука, будет ли человечество развиваться в сторону неограниченного лучезарного восхождения или же оно скатится в пропасть. Я уверен, что пропасти не будет.

**П. С. АЛЕКСАНДРОВ.**

Человек сейчас занимается такими проблемами, что у него дух захватывает и кружится голова. Однако пока вы не почувствуете легкого головокружения, вам не удастся понять их суть. Проблемы важнее решения. Решения могут устареть, а проблемы остаются.

**Н. БОР.**

Мы... отыскиваем свой путь посредством проб и ошибок, строя свою дорогу позади себя по мере того, как мы продвинулись вперед.

**М. БОРН.**

Наука выигрывает, когда ее крылья раскованы фантазией.

**М. ФАРАДЕЙ.**

Ученый без дарования подобен тому бедному мулле, который изрезал и съел Коран, думая исполниться духа Магометова.

**А. С. ПУШКИН.**

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 21191 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 2001.